**161.** Прачытайце. Пастаўце назоўнікі ў дужках у форму творнага склону.

1. Не спяшайся языком, а спяшайся *(справа)*. 2. За *(вада)* і саломінка паплыве. 3. З добрай *(песня)* жыць весялей. 4. Лепей хлеб з *(вада)*, як пірог і мёд з *(бяда)*. 5. І пад белаю *(кашуля)* душа бывае брудная. 6. Хадзі простай *(дарога)*, то не заблудзіш.

Запішыце прыказкі. Абазначце канчаткі ў назоўніках 1-га скланення ў творным склоне.

## Назоўнікі 2-га скланення, іх канчаткі

**162.** Прачытайце назоўнікі. Да якога тыпу скланення яны адносяцца? Вызначце аснову ў кожным назоўніку. Назавіце апошні зычны асновы.

Горад, вучань, лось, гай, палец, дождж, ранак, нос, госць, конь, чай, плывец, мантаж, ельнік, пірог, мох, сон, дом, прамень, рог, урач.

**плыве́ц**

Запішыце назоўнікі ў чатыры слупкі па ўзоры.

| Узор: | аснова на цвёрды зычны | аснова на мяккі зычны | аснова на зацвярдзелы зычны | аснова на ***г, к, х*** |
|---|---|---|---|---|
| | *горад* | *вучань* | *палец* | *ранак* |
| | … | … | … | … |

**163.** Разгледзьце табліцу. Параўнайце канчаткі ў назоўніках 2-га скланення мужчынскага роду ў розных склонах.

| Склон | М. р., нулявы □ з асновай | | | |
|---|---|---|---|---|
| | **на цвёрды зычны** | **на мяккі зычны** | **на зацвярдзелы зычны** | **на *г, к, х*** |
| **Н.** | *горад* □ | *вучань* □, *гай* □ | *дождж* □ | *ранак* □ |
| **Р.** | *горад* [*а*] | *вучн* [*я*], *га* [*ю*] | *дождж* [*у*] | *ранк* [*у*] |
| **Д.** | *горад* [*у*] | *вучн* [*ю*], *га* [*ю*] | *дождж* [*у*] | *ранк* [*у*] |
| **В.** | *горад* □ | *вучн* [*я*], *гай* □ | *дождж* □ | *ранак* □ |
| **Т.** | *горад* [*ам*] | *вучн* [*ем*], *га* [*ем*] | *дождж* [*ом*] | *ранк* [*ам*] |
| **М.** | *(у) горадз* [*е*] | *(пры) вучн* [*ю*], *(у) га* [*і*] | *(на) дождж* [*ы*] | *(у) ранк* [*у*] |

Калі супадаюць канчаткі ў назоўніках мужчынскага роду ў назоўным і вінавальным склонах? У родным і вінавальным склонах?

Вусна праскланяйце назоўнікі *нос, госць, чай, мантаж, ельнік*. Выкарыстайце ўзор скланення слоў, прапанаваны ў табліцы *(нос ⟶ горад, госць ⟶ вучань, чай ⟶ гай, мантаж ⟶ дождж, ельнік ⟶ ранак)*.

Калі назоўнік мужчынскага роду 2-га скланення адказвае на пытанне к т о?, то ён мае аднолькавыя канчаткі ў формах **роднага** і **вінавальнага** склонаў. Калі ён адказвае на пытанне ш т о?, то мае аднолькавыя канчаткі ў формах **назоўнага** і **вінавальнага** склонаў.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**164.** Прачытайце. Выпішыце тыя сказы, у якіх выдзеленыя назоўнікі з'яўляюцца дзейнікамі. Пазначце склон гэтых назоўнікаў. Абазначце ў іх канчаткі.

1. Учора настаўнік і дзеці залілí **каток** каля школы. **Каток** іскрыўся пад яркім сонцам. 2. **Хакей** падабаецца і дарослым, і дзецям. Цэлы дзень хлопчыкі гулялі ў **хакей**. 3. **Снег** засы́паў каток. Хлопчыкі ўбралі **снег** з катка.

У якім склоне ўжыты выдзеленыя словы ў астатніх сказах?

?! Як можна адрозніць формы назоўнага і вінавальнага склонаў назоўнікаў 2-га скланення ў сказах?

**165.** Прачытайце верш. Якія словы ўжыты ў ім у пераносным значэнні?



**Зіма**

Паб..ліла зімка **ле..**,
паб..ліла поле.
І **маро..** на шыбы ўзле..,
**ве..ер** заскуголіў.

*М. Маскевіч.*

Спішыце верш, устаўляючы патрэбныя літары. Вызначце склон выдзеленых назоўнікаў.

**166.** Запішыце спалучэнні слоў. Вызначце ў іх склон назоўнікаў 2-га скланення.

Прывіталі госця, сумка госця; сустрэлі хакеіста, форма хакеіста; кармушка для снегіра, убачылі снегіра; напалохалі зайца, лапка зайца.

?! Карыстаючыся падказкай, растлумачце, як вызначыць склон гэтых назоўнікаў.

Падказка: *прывіталі* (к а г о?) ***госця*** — *прывіталі*

В. В.

(к а г о?) ***маму*** → ***госця***;

Р. Р.

*сумка* (к а г о?) ***госця*** — *сумка* (к а г о?) ***мамы*** → ***госця***.

**167.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Дзед пад Новы год
водзіць з намі карагод,
і спявае,
і смяецца...
Ну а як
той дзед
завецца?

*А. Зэкаў.*



Спішыце. Знайдзіце ў вершы назоўнікі 2-га скланення, вызначце іх склон.

❖ Падкрэсліце ў словах літары, правапіс якіх трэба правяраць. Вусна падбярыце праверачныя словы.

**168.** Прачытайце назоўнікі. Да якога тыпу скланення яны адносяцца? Вызначце аснову ў кожным назоўніку. Назавіце апошні зычны асновы.

Акно, жыццё, каменне, возера, рэха, вясло, воблака, голле, падарожжа, варэнне, дупло, зацішша.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

Запішыце назоўнікі ў чатыры слупкі па ўзоры.

| Узор: | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | аснова на цвёрды зычны | аснова на мяккі зычны | аснова на зацвярдзелы зычны | аснова на ***г, к, х*** |
| | *акно* | *жыццё* | *возера* | *рэха* |
| | ... | ... | ... | ... |

**169.** Разгледзьце табліцу. Параўнайце канчаткі ў назоўніках 2-га скланення ніякага роду ў розных склонах.

| Склон | Н. р., канчаткі ***-о, -е, -а, -ё*** з асновай | | | |
|---|---|---|---|---|
| | **на цвёрды зычны** | **на мяккі зычны** | **на зацвярдзелы зычны** | **на *г, к, х*** |
| **Н.** | *акн\|о* | *каменн\|е* | *возер\|а* | *рэх\|а* |
| **Р.** | *акн\|а* | *каменн\|я* | *возер\|а* | *рэх\|а* |
| **Д.** | *акн\|у* | *каменн\|ю* | *возер\|у* | *рэх\|у* |
| **В.** | *акн\|о* | *каменн\|е* | *возер\|а* | *рэх\|а* |
| **Т.** | *акн\|ом* | *каменн\|ем* | *возер\|ам* | *рэх\|ам* |
| **М.** | *(на) акн\|е* | *(на) каменн\|і* | *(на) возер\|ы* | *(у) рэх\|у* |

У якіх склонах назоўнікі 2-га скланення ніякага роду маюць аднолькавыя канчаткі?

Вусна праскланяйце назоўнікі *вясло, варэнне, падарожжа, воблака*. Выкарыстайце ўзор скланення слоў, прапанаваны ў табліцы (*вясло* → *акно, варэнне* → *каменне, падарожжа* → *возера, воблака* → *рэха*).

**Назоўнікі ніякага роду 2-га скланення маюць аднолькавыя канчаткі ў формах назоўнага і вінавальнага склонаў.**

**170.** Прачытайце. Чаму так гавораць?

1. Добр**ае** слова **не** забываецца. 2. Сказанага слова ніхто **за** хвост **не** злові**ць**. 3. Кожны **ча**лавек памятае добр**ае** слова.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар і слоў. Вызначце склон назоўнікаў 2-га скланення.

Запішыце па памяці адзін сказ на выбар.

**171.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна яе вымаўляць.

Возера маро.. ільдом накры..,
нібы **сер..брыстым** шклом зашклі.. .
*М. Пазнякоў.*

Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары. Вызначце склон назоўнікаў 2-га скланення.

Разбярыце па саставе выдзеленае слова.

**172.** Прачытайце тэкст.

### Перад Калядамі

Аднойчы перад Калядамі сняжынкі вадзілі святочны карагод. Адна з іх пачала апускацца на зямлю.



Правообладатель Акадэмія адукацыі



Сняжынка пачула дзіцячы смех. Хлопчык і дзяўчынка ляпілі снегавіка. Сняжынка хацела сесці на снегавіка. Раптам яна заўважыла сумнага хлопчыка. Ён назіраў за дзецьмі, але не дакранаўся да халоднага снегу. Хлопчык доўга хварэў. Мама толькі сёння дазволіла яму выйсці на двор.

Сняжынка адчула гэта. У яе было добрае сэрца. Калі хлопчык працягнуў насустрач далоньку, яна апусцілася на рукавічку.

— Мама, паглядзі, якая прыгажуня! — радасна закрычаў хлопчык.

Сняжынка ажно паружавела ад задавальнення. Яна зразумела, што прыносіць радасць іншым лепш, чым радавацца самой. *(Паводле С. Ярашэвіч.)*

Як вы здагадаліся, што прачыталі казку? Як сняжынка парадавала хлопчыка? Прачытайце сказ, у якім перадаецца асноўная думка тэксту.

**сёння**

На колькі частак можна падзяліць тэкст? Пра што ідзе размова ў кожнай частцы? Запішыце тую частку тэксту, якая адпавядае малюнку.

Знайдзіце ў запісаных сказах назоўнікі адзіночнага ліку 2-га скланення. Вызначце іх склон.

**Рм** Раскажыце, што вы ведаеце пра Каляды. Як іх святкуюць? Якія цуды могуць адбывацца ў гэты час?

**173.** Спішыце сказы. Падкрэсліце ў іх дзейнік і выказнік.

1. Раніцай дзеці прыйшлі на **возера**. **Возера** пакрылася льдом. 2. Вучні прыбралі сухое **голле** з-пад дрэў. Сухое **голле** трашчала пад нагамі. 3. Бацькі і дзеці адправіліся ў **падарожжа**. **Падарожжа** запомнілася і вучням, і настаўніцы.

Вызначце склон выдзеленых назоўнікаў.

## Родны склон

**174.** Прачытайце спалучэнні слоў. Вызначце род і склон выдзеленых назоўнікаў. Назавіце іх канчаткі.

клюшка **брата**
дачакаўся **аўтобуса**
ракетка для **тэніса**
дні **тыдня**

машына **пяску**
схаваліся ад **дажджу**
дайшлі да **лугу**
заплакала ад **болю**

Якія канчаткі маюць у родным склоне назоўнікі 2-га скланення мужчынскага роду?



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**Назоўнікі мужчынскага роду 2-га скланення ў родным склоне маюць канчаткі:**

| *-а, -я* | *-у, -ю* |
|---|---|
| калі абазначаюць | |
| жывых істот (*чалавека, мядзведзя*) | рэчывы (*цукру, чаю*) |
| канкрэтныя прадметы (*сшытка, бінокля*) | з'явы прыроды (*ветру, інею*) |
| спартыўныя гульні, танцы (*хакея, вальса*) | прасторавыя паняцці (*краю, усходу*) |
| адрэзкі часу (*дня, месяца*) | якасці, дзеянні, стан (*розуму, руху, спакою*) |

**Канчаткі** ў назоўніках **роднага склону** можна правяраць **па арфаграфічным слоўніку.**

**175.** Пастаўце назоўнікі ў форму роднага склону па ўзоры.

*агурок — агурка*
стол — ...
аловак — ...
футбол — ...

*пры́яцель — пры́яцеля*
вучань — ...
тыдзень — ...
рубель — ...

*цукар — цукру*
шакалад — ...
сок — ...
ранак — ...

*брат — брата*
сусед — ...
урач — ...
дзяцел — ...

*бярэзнік — бярэзніку*
сад — ...
свет — ...
палёт — ...

*агонь — агню*
клей — ...
цень — ...
боль — ...

**176.** Прачытайце прыказкі. Слова ў дужках пастаўце ў тую ж форму, што і выдзеленае слова. Чаму так гавораць?

1. Чалавек без **сябра** — што дрэва без *(корань)*. 2. З **адкладу** няма *(лад)*.

Спішыце. Знайдзіце ў прыказках назоўнікі 2-га скланення ў родным склоне. Выдзеліце ў іх канчаткі. Растлумачце правапіс канчаткаў.

**Гаварыце правільна!**

Многа хлеб**а**, склон назоўнік**а**, назоўнага склон**у**.

**177.** Прачытайце загадку. Словы ў дужках пастаўце ў форму роднага склону.

Танцуе з ветрам,
*(снег)* набраўшы ў прыпол,
аж белага *(свет)*
не бачыць яна вакол.

*М. Маляўка.*




З «рассыпаных» складоў складзіце слова-адгадку. Вусна падбярыце да яго сінонімы.

Спішыце загадку. У назоўніках 2-га скланення ў родным склоне абазначце канчаткі.

**178.** Запішыце прыказкі. Пастаўце назоўнікі ў дужках у форму роднага склону. Абазначце ў іх канчаткі.

-*а*, -*я* 1. *(Гультай)* зямля не любіць. 2. Трэба нахіліцца, каб з *(ручай)* напіцца. 3. Ле́жачы *(хлеб)* не дабудзеш.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

-*у*, -*ю* 1. *(Дым)* без *(агонь)* не бывае. 2. Не налавіўшы пчол, не есці *(мёд)*. 3. Без *(дождж)* і трава не расце. 4. З вялікага *(гром)* малы дождж бывае.

**179.** Прачытайце спалучэнні слоў. Вызначце род і склон выдзеленых назоўнікаў. Назавіце іх канчаткі.

| | |
|---|---|
| палова **вядра** | схавалася сярод **голля** |
| бераг **мора** | засмяяўся ад **шчасця** |

Якія канчаткі маюць назоўнікі 2-га скланення ніякага роду ў родным склоне?

**Назоўнікі ніякага роду 2-га скланення ў родным склоне маюць канчаткі *-а, -я* (*дабра, крылля*).**

**180.** Запішыце прыказкі. Пастаўце назоўнікі ў дужках у форму роднага склону. Абазначце ў іх канчаткі.

1. Выказанага *(слова)* да губы́ не вернеш.
2. *(Уменне)* за плячыма ніхто не носіць.

**181.** Прачытайце тэкст. Назоўнікі ў дужках пастаўце ў форму роднага склону. Што атрымаў чалавек у спадчыну ад дзеда? Растлумачце значэнне выдзеленага выразу.

Адзін чалавек рашыў збудавацца. Купіў ён бярвенне, прывёз на будоўлю. Чалавек гэты быў **майстар на ўсе рукі**. Ён меў добрыя інструменты. Яны дасталіся яму ад *(дзед)* — вядомага цесляра. Узяў ён у рукі тапор і пачаў зруб ладзіць. Бервяно да *(бервяно)*, сцены

роўныя, гладкія. Стараецца цясляр і ўсё тапор *(дзед)* нахвальвае.

Тапару падабалася, калі гаспадар хваліў яго перад суседзямі. А тыя толькі лагодна пасмейваліся. Яны ведалі, што чалавек пераняў ад *(дзед)* цяслярскае ўмельства. *(Паводле П. Саковіча.)*



**цясля́р** — рабочы, які ўзводзіць драўляныя будынкі, вырабляе драўляную мэблю; *рус.* пло́тник

Запішыце сказы, у якіх вы змянілі форму назоўнікаў. Абазначце канчаткі ў назоўніках у родным склоне.

Рм Якая прыказка з папярэдняга практыкавання падыходзіць да зместу тэксту? Чаму вы навучыліся ў сваякоў?

**182.** Назоўнікі ў дужках пастаўце ў патрэбную форму. Запішыце спалучэнні слоў.

Кубак *(малако)*, прамень *(сонца)*, край *(поле)*, жменя *(насенне)*.

Дакрануўся да *(вуха)*, дабеглі да *(возера)*, дацягнуўся да *(вясло)*, дабралася да *(узлессе)*, даляцеў да *(гняздо)*.

Вызначце склон і абазначце канчаткі ў назоўніках ніякага роду. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**183.** Прачытайце. Назоўнікі ў дужках пастаўце ў патрэбную форму. Чаму верш мае такую назву?



**Пачатак**

Лес пачынаецца з зязюлі.
Нябёсы — з песні *(жаўрук)*.
Людская дабрыня — з матулі.
З крыніцы — шумная рака.

З хусцінкі белай — развітанне.
Сустрэча — з радасці *(чаканне)*.
Прастор — з бязмежнасці палёў.
Смак *(хлеб)* — з нашых мазалёў.

*М. Башлакоў.*

Спішыце. Знайдзіце ў вершы назоўнікі адзіночнага ліку ў родным склоне. Абазначце ў іх канчаткі. Зверху над назоўнікамі ўкажыце тып скланення.

## Давальны склон

**184.** Прачытайце спалучэнні слоў. Вызначце род і склон назоўнікаў. Назавіце іх канчаткі.

сказа́ў настаўніку
усміхнуўся таварышу
параіў вадзіцелю
падзякаваў пры́яцелю

прысвяціў гораду
дапамог класу
не паверыў шчасцю
узрадаваўся медалю́

Якія канчаткі маюць у давальным склоне назоўнікі 2-га скланення?

**Назоўнікі 2-га скланення ў давальным склоне маюць канчаткі *-у, -ю* (*сябр[у], жаданн[ю]*).**

**185.** Прачытайце верш. Як трэба сустракаць кожны новы дзень?



### Новы дзень

Пара́ прачынацца аконцу,
а(*д/т*)крыем на ім фіранку.
— Дзень добры! —
мы скажам сонцу,
і небу, і светламу ранку.

*С. Мінскевіч.*

Спішыце, раскрываючы дужкі. Знайдзіце назоўнікі ў давальным склоне. Абазначце ў іх канчаткі.

**186.** Запішыце прыказкі. Пастаўце назоўнікі ў дужках у форму давальнага склону. Абазначце ў іх канчаткі.

1. Усякаму (*чалавек*) сонейка свеціць. 2. Не трэба (*салавей*) залатая клетка, а трэба (*салавей*) зялёная ветка.

**187.** Прачытайце сказы. Вызначце склон выдзеленых назоўнікаў.

1. Дрэвы нахіліліся ад **ветру**. Алесь ехаў на веласіпедзе насустрач **ветру**.
2. Камбайн даехаў да **краю** поля. Таленавітыя людзі прыносяць славу роднаму **краю**.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

3. Усе чакалі **дажджу.** Расліны і жывёлы радаваліся **дажджу.**

Выпішыце тыя сказы, у якіх выдзеленыя назоўнікі ўжыты ў форме давальнага склону.

Падкрэсліце ў запісаных сказах дзейнік і выказнік.

**188.** Пастаўце назоўнікі ў дужках у форму давальнага склону. Запішыце спалучэнні слоў, якія атрымаліся.

*Дзякаваў герою*, падзякаваў *(хлапчук)*, дзякавала *(вучань)*, падзякавалі *(каваль)*.

*Радавалася госцю*, радаваліся *(жыццё)*, узрадавалася *(падарожжа)*, парадавалася *(здарэнне)*.

*Сказаў чалавеку*, казаў *(дзед)*, расказаў *(брат)*, паведаміў *(таварыш)*.

*Даў ласю*, зрабіў *(конь)*, прынёс *(парсюк)*, насыпаў *(папугай)*.

❖ З адным спалучэннем слоў на выбар прыдумайце і запішыце сказ.

## Творны склон

**189.** Прачытайце спалучэнні слоў. Вызначце род і склон назоўнікаў. Назавіце іх канчаткі.

| | |
|---|---|
| спыніліся за горадам | ганарылася вучнем |
| звініць за акном | замахнуўся кап'ём |

Якія канчаткі маюць у творным склоне назоўнікі 2-га скланення? Якія канчаткі пішуцца пад націскам? Якія канчаткі пішуцца не пад націскам?

**Назоўнікі 2-га скланення ў творным склоне пад націскам маюць канчаткі *-ом, -ём*, не пад націскам — *-ам, -ем*.**

**190.** Пастаўце назоўнікі ў дужках у форму творнага склону. Запішыце спалучэнні слоў.

Любаваліся мядзведзем, *(певень)*, *(ранне)*; любаваліся арлом, *(грак)*, *(палатно)*; назіралі за кракадзілам, за *(тыгр)*, за *(вогнішча)*; назіралі за ласём, за *(конь)*, за *(акунь)*.

**Гаварыце правільна!**

Пакрылася лёд**ам** (льд**ом**), пакрыў ільд**ом**, зарос мох**ам** (імх**ом**).

**191.** Прачытайце тэкст. Назоўнікі ў дужках пастаўце ў форму творнага склону. Чым вабіць да сябе рабіна?

### Рабіна



За маім *(акно)* расце рабіна. Яе *(хлапчук)* пасадзіў мой бацька. Калі летняй раніцай я адчыняю акно, то магу рукой дакрануцца да лісця і галінак.

Я люблю назіраць за *(дрэва)*. У розныя поры года яно выглядае па-рознаму. У верасні рабіна шапаціць пад *(вецер)*



Правообладатель Акадэмія адукацыі

жоўтым *(лісце)*. Гронкі ягад чырванню гараць на сонцы. У маразы ўспамінаюць пра рабіну вераб'і і сініцы. А вясной дрэўца абуджаецца, як спячая прыгажуня. Яно становіцца асабліва прывабным.

Запішыце сказы, у якіх вы змянілі форму назоўнікаў. Абазначце канчаткі ў назоўніках у творным склоне.

**Рм** Ці садзілі вы дрэвы? Хто вам у гэтым дапамагаў?

Знайдзіце ў тэксце слова, аднакаранёвае да слоўнікавага. Запішыце пару слоў. Падбярыце аднакаранёвы назоўнік да запісаных слоў. Утварыце і запішыце форму творнага склону гэтага назоўніка.

**уле́тку**

**192.** Прачытайце верш. Назоўнікі ў дужках пастаўце ў патрэбную форму.

## Вясёлка

Дзень нязвычны, дождж і сонца.
А над *(лес)*, а над *(край)*
сямiструнная вясёлка
гожа колерамі грае.

*В. Жуковіч.*

Запішыце другі сказ па памяці. Вызначце склон назоўнікаў 2-га скланення адзіночнага ліку. Абазначце ў іх канчаткі.

**Рм** Калі з'яўляецца на небе вясёлка? Чаму? Пры неабходнасці запытайцеся пра гэта ў старэйшых або знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.

Успомніце і раскажыце вядомыя вам загадкі пра вясёлку.

**193.** Спішыце. Назоўнікі ў дужках пастаўце ў патрэбную форму.

1. Хвошча, хвошча дождж,
   воўк схаваўся ў хвошч.
   Хвост пад *(хвошч)*,
   а сам пад *(дождж)*.
   *В. Вітка.*





2. *(Сена)* шапаткім
   у шалашы,
   мышка шустрая,
   уночы не шуршы.
   *М. Пазнякоў.*

Вызначце склон назоўнікаў, форму якіх вы змянілі. Абазначце ў іх канчаткі.

❖ Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць адну са скорагаворак.

## Месны склон

**194.** Прачытайце спалучэнні слоў. Вызначце род і склон назоўнікаў. Назавіце іх канчаткі.

| | |
|---|---|
| сказаў пры сыне | убачыў у кошыку |
| жылі ў доме | ляжыць у мяху |
| раслі ў полі | плавае ў возеры |
| заспрачаліся пры госцю | гаварылі пры настаўніку |

Якія канчаткі маюць у месным склоне назоўнікі 2-га скланення?



Правообладатель Акадэмія адукацыі

Назоўнікі 2-га скланення ў месным склоне маюць канчаткі ***-е, -і, -ы, -у, -ю.***

| Назоўнікі з асновай | Канчаткі | |
|---|---|---|
| | назоўнікаў, якія называюць чалавека | астатніх назоўнікаў |
| на ***цвёрды*** зычны | ***-е*** *(пры сын**е**, у горадз**е**)* | |
| на ***мяккі*** зычны | ***-ю*** *(пры вучн**ю**)* | ***-і*** *(на кан**і**)* |
| на ***зацвярдзелы*** зычны | ***-у*** *(пры токар**у**)* | ***-ы*** *(на мор**ы**)* |
| на ***г, к, х*** (калі не адбываецца чаргаванне) | ***-у*** *(пры настаўнік**у**, у парк**у**)* | |

**195.** Пастаўце назоўнікі ў форму меснага склону па ўзоры.

*Горад — у горадзе*, дом — …, сад — …; *лось — на ласі*, корань — …, пень — …; *вецер — на ветры*, палец — …, сонца — …; *цвік — на цвіку*, урок — …, каток — … .

*Артыст — пры артысце*, тэнісіст — …, піяніст — …; *каваль — пры кавалю*, кароль —…, князь — …; *токар — пры токару*, дырыжор — …, мастак — … .

**196.** Прачытайце тэкст. Назоўнікі ў дужках пастаўце ў патрэбную форму. Хто аказаўся ў большай пашане: дуга ці падкова? Чаму?

## Дуга і падкова

Дуга аднойчы даведалася, што падкова — яе далёкая сваячка. У іх шмат падабенства.



— Ну і сваячка! — высмейвала яна падкову. — Яе нагамі ў гразь топчуць! Вось я на цёплым *(месца)* сяджу, на *(конь)*. Мяне ўсе шануюць.

Непрыкметна ішоў час. Драўляная дуга патрэскалася, струхлела. Праўда, згубілася і сцёртая падкова. Дуга не бачыла, як падкову знайшоў чалавек і панёс дахаты, каб павесіць над дзвярыма — на шчасце.

А ганарлівая дуга струхлела ў глухім *(закуток)*. *(Паводле П. Саковіча.)*

Запішыце сказы, у якіх вы змянілі форму назоўнікаў. Вызначце склон гэтых назоўнікаў, абазначце ў іх канчаткі.

**197.** Спішыце прыказкі. Пастаўце назоўнікі ў дужках у патрэбную форму. Чаму так гавораць?

1. Золата і ў *(балота)* свеціцца. 2. Пазнаю́ць птушку па *(палёт)*. 3. Золата і ў *(попел)* відаць.

**198.** Пастаўце назоўнікі ў дужках у форму меснага склону па ўзоры. Запішыце спалучэнні слоў.

*Ехалі на кані*, праехалі на *(алень)*; *плылі́ па моры*, паплылі па *(возера)*; *хадзілі па лесе*, пахадзілі па *(сад)*; *гулялі па сняжку*, пагулялі па *(парк)*.

З адным спалучэннем слоў складзіце і запішыце сказ.



Правообладатель Акадэмія адукацыі